# Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР пану Наталевічу

# Старшыні Савета Народных Камісараў Беларускай ССР пану Панамарэнка

Насельніцтва нашай ляжачай у развалінах сталіцы Варшавы і разам з ім увесь польскі народ в гарачай удзячнасцю прымае выказванні сардэчнай дружбы з боку брацкага славянскага беларускага народа, дружба якога засведчана вядомай дапамогай праз Вас. Удзячнасць польскага народа з'яўляецца тым большай, што гэты дар дае народ, які ў цяжкай працы аднаўляе разбураную гітлераўскімі грабіцелямі сваю краіну і сталіца якога ляжыць у развалінах, падобна Варшаве. Беларускі і польскі народы, аб'едналыя нянавісцю да агульнага ворага—нямецкага фашызма, цяпер звязаныя агульнай радасцю перамогамі Чырвонай Арміі, якая, вызваляючы польскія землі, стаіць ужо ля варот жудаснага гітлераўскага логава. Агульныя пакуты, агульная барацьба, разам пралітая кроў, а цяпер агульная радасць з'яўляецца поўнай гарантыяй будучай блізкай і сардэчнай дружбы абодвух народаў. Дар, прынесены брацкім беларускім народам, будзе захаваны назаўсёды ва ўдзячнай памяці палякаў, якія атрымліваюць гэтую дапамогу ў цяжкі момант аднаўлення незалежнай дэмакратычнай польскай дзяржавы з руін і папялішчаў.

Ад імені Польскай рэспублікі, якая адрадзілася, пасылаем сардэчнае віншаванне асабіста Вам, як прадстаўнікам брацкага народа, з якім плячом к плячу ў сям'і другіх славянскіх народаў змагаліся і будзем змагацца з нямецкімі захопнікамі да поўнай перамогі.

Няхай жыве польска-савецкая дружба!

Няхай жыве Беларуская Савецкая Рэспубліка!

**Прэзідэнт Краёвай Рады Народовай Балеслаў БЕРУТ.**

**Прэм'ер часовага урада Эдвард ОСУБКА-МАРАЎСКІ.**